*Асобы*

# ЧАЛАВЕК-СУСВЕТ

## ДА 65-ГОДДЗЯ ІВАНА ШТЭЙНЕРА



Сёння ён вядомы вучоны, таленавіты пісьменнік, мудры настаўнік, аўтарытэтны кіраўнік. Яго тытанічная праца ў галіне літаратуразнаўства здзіўляе нават самага стараннага і руплівага дзеяча. Яго імя – Іван Штэйнер. Іван Фёдаравіч – яркая індывідуальнасць, харызматычная асоба. Чалавек, які варты таго, каб яго ведалі.

**Неўтаймаванасць.** Ён заўсёды носіць у сабе Ідэю. Адну, другую, трэцюю… дзясятую. Планы, думкі, жаданні бесперапынна віруюць унутры, увасабляючыся ў кнігах, праектах, музеях, артыкулах, паездках. Неверагодным чынам вялікая колькасць ідэй рэалізуецца. І нават калі што-небудзь на сёння засталося нявырашаным, яно не забываецца, а чакае моманту, калі Іван Штэйнер абавязкова здзейсніць задуманае.

**Бацька.** Партрэт бацькі заўсёды стаіць перад вачыма Прафесара ў яго працоўным кабінеце. Менавіта з бацькавых песень усё і пачалося. Іван Фёдаравіч мала расказвае пра дзяцінства і юнацтва, гэта яго асабісты скарб, але бацькавы песні ўспамінае часта, яны гучалі па-беларуску, па-ўкраінску, па-польску, па-руску. Ад таго і душа ў Івана Штэйнера такая – шматстайная, багатая. Ён таксама спявае, кожны дзень, ва ўніверсітэце і на вуліцы, дзе выпадковы мінак абавязкова азірнецца, пачуўшы спевы такога каларытнага мужчыны.

**Радзіма.** Ён вельмі любіць сваю вёску. Асаблівай, таемнай любоўю. Іван Фёдаравіч часта расказвае пра драўляную царкву, якая існуе ўжо каля 300 гадоў і знаходзіцца недалёка ад месца яго нараджэння. Збіраючыся чарговы раз у роднае Беражное, ён звычайна кажа: “Паеду…”, “Бо я з’язджаю…” і маўчыць. Усе ўжо ведаюць, што ён паедзе ў вёску, і адчуваюць, якая глыбіня хаваецца за тым маўчаннем. Для яго зямля, на якой ён нарадзіўся, – святая.

Магчыма, менавіта такая жыццёвая пазіцыя дазволіла ўраджэнцу Століншчыны падарыць жыхарам Гомеля і Гомельскай вобласці ўнікальнае бачанне іх роднага краю, на стагоддзі захаваць яго духоўнае багацце, прыгажосць народнай думкі і самавыяўлення, моц і неўтаймаванасць духу на старонках анталогій, сапраўдных летапісаў творчых і жыццёвых дасягненняў “Мазыр літаратурны”, “Речица. Литературно-духовное наследие региона. В 2 томах”, “Гомельщина олимпийская”, “Дняпроўскія матывы”, “Alma mater universitatis”, “Сожскі карагод”, “Прыпяцкая рапсодыя”.

**Кафедра.** Кафедра беларускай літаратуры ў ГДУ імя Францыска Скарыны – адна з самых моцных у краіне. Іван Штэйнер на пасадзе загадчыка кафедры – 35 гадоў! Яго творчы запал і энергія натхняюць кожнага супрацоўніка. Ён – прыклад адданасці працы. А самае галоўнае, што для Івана Фёдаравіча заўсёды важныя вынікі. Іван Штэйнер – лідар па падрыхтоўцы новых вучоных. Ён – навуковы бацька, які клапоціцца пра кожнага аспіранта: спачатку прапануе актуальную тэму, дае абсалютную свабоду яе разумення і даследавання, ненавязліва накіроўваючы ў складаных даследчых пошуках і жыццёвых перыпетыях, і гэтая апека не спыняецца і праз 10, 20 гадоў пасля навучання. Заканамерна, што сёлета была абароненая доктарская дысертацыя А. Мельнікавай, навуковым кансультантам якой быў Іван Штэйнер. Акрамя таго, пад мудрым кіраўніцтвам Прафесара шлях да акадэмічнай дасканаласці знайшлі 13 кандыдатаў філалагічных навук, а колькі яшчэ наперадзе!

Даследаванні, якія праводзяцца супрацоўнікамі кафедры беларускай літаратуры пад кіраўніцтвам Івана Фёдаравіча, ахопліваюць гісторыю і тэорыю літаратуры, рэгіянальныя асаблівасці, міжкультурныя камунікацыі. Гомельская літаратуразнаўчая школа актыўна прадстаўлена на старонках рэспубліканскіх пе-

рыядычных выданняў і замежных навуковых часопісаў. Добра ведаюць гомельскіх вучоных-філолагаў і як актыўных удзельнікаў кангрэсаў, з'ездаў, канферэнцый. Прафесар таксама заснавальнік навуковай школы "Рэгіянальны, агульнанацыянальны і агульначалавечы ўзроўні ў літаратуры: духоўная спадчына беларусаў у сусветным кантэксце", у межах якой праводзіцца Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная светлай памяці народнага пісьменніка Беларусі І. Навуменкі, выходзіць перыядычны зборнік навуковых работ "Спадчына І. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства".

**Творчасць.** "Я хачу ўсё перапісаць" – так абгрунтоўвае сваю чарговую ідэю Іван Штэйнер. Пад гэтым "усё" Іван Фёдаравіч разумее гісторыю беларускай літаратуры. Задума здаецца маштабнай, але пэўнай. Якое ж здзіўленне выклікае ў чытача кожная новая кніга І. Штэйнера, калі ў ёй гэтае "ўсё" з'яўляецца насамрэч усім: сусветнай філасофіяй, культурай, традыцыямі, літаратурай, менталітэтамі, гісторыяй… Маштаб мыслення неверагодна вялікі. Прафесар заўсёды заклікае вучняў і калег не баяцца быць унікальнымі, выбітнымі, неардынарнымі, рабіць усё інакш, не так, як папярэднікі ці сучаснікі, нараджаць новыя формы – як у літаратуры, навуцы, так і ў паўсядзённым жыцці. Пры гэтым Іван Фёдаравіч заўсёды падкрэслівае, што ў сваіх акадэмічных і творчых пошуках ён "стаіць на плячах гігантаў", захапляючыся геніямі Антычнасці, вялікімі мыслярамі класічнай эпохі, дэміургамі нацыянальных культур.

**Асвета.** Яшчэ адна іпастась, без якой партрэт Івана Фёдаравіча быў бы няпоўным, – гэта яго няспынная праца на ніве даследавання, развіцця і папулярызацыі айчыннага мастацкага слова, адным з пацверджанняў чаго з'яўляецца вялікая колькасць апублікаваных прац. І гэтая колькасць значна ўзбагачае якасць. Навуковыя і мастацкія работы Івана Штэйнера, ці Івана Прылуцкага (псеўданім узяты са старажытнага шляхецкага роду Прылуцкіх, з якога паходзіць Прафесар), адлюстроўваюць унікальны светапогляд аднаго з самых значных вучоных нашага часу.

Іван Штэйнер вядомы нам як тэарэтык літаратуры (чаго толькі вартае самае поўнае ў свеце даследаванне беларускай балады); літаратуразнаўца і крытык, наватар, рэстаўратар пакрытай пацінай і пылам гадоў класікі (менавіта дзякуючы яму наш сучаснік зразумеў усю глыбіню біблейскай сімволікі Рыгора Барадуліна, яшчэ раз адкрыў для сябе беларускага генія Анатоля Сыса, на фоне класічнай традыцыі асэнсаваў паэзію Уладзіміра Караткевіча, а творы Алеся Разанава – у звязку з усім багаццем сусветнай філасофскай думкі); кампаратывіст, філосаф і вучоны-мультыінструменталіст; драматург і папулярызатар нацыянальнай і сусветнай класікі. Невыпадкова А. Мельнікава назвала Прафесара "Умбэрта Эка беларускага літаратуразнаўства", паколькі яго работы заўсёды выключныя, неардынарныя, напоўненыя алюзіямі і рэмінісцэнцыямі.

**Гумар.** Кожны, хто ведае Івана Фёдаравіча асабіста ці прачытаў хоць бы адну з ягоных навуковых ці мастацкіх кніг, ахвотна пагодзіцца, што выбітнасць гэтага даследчыка і пісьменніка заключаецца таксама ў яго выдатнай здольнасці заўважаць шматлікія супярэчнасці ў навакольным свеце і адэкватна рэагаваць на іх ці, кажучы проста, смяяцца. Гумар ёсць неад'емны кампанент светаўспрымання Прафесара. З усмешкай ён ставіцца да ўласнай творчасці, называючы яе "браканьерствам у чужых надзелах". Камічнымі створаны большасць п'ес Івана Прылуцкага: "Кот-ваявода", "Шлюб па прымусу", "Кот на лаўрах". Як слушна заўважыла даследчыца Н. Суслава, разважаючы пра карнавальную прыроду першага твора, смех аўтара асаблівы: "Тут няма ідэі разбурэння да асновы, дакладней, яна ёсць, але гэтае разбурэнне праз смех дазваляе вызначыць той самы культурны слой, што застанецца і будзе той платформай, на якой будзе будавацца новы цудоўны свет – на тых максімах антычных мудрацоў, на словах Эразма Ратэрдамскага". Своеасаблівы праваднік да ўнікальнага разумення Прафесарам сутнасці смеху ў чалавечай культуры – трагікамедыя "Мудрости зачало и конець...", якая стала не проста чарговай гісторыяй пра вялікага ўсходнеславянскага першадрукара, але роздумам пра Боскае наканаванне, сутнасць мастацтва, вялікую місію і невыносны цяжар пасіянарыя. Канчаткова штэйнераўская канцэпцыя беларускага гумару як з'явы амбівалентнай была ўвасоблена ў маштабным даследаванні "Смехъ зъ болѣстию смешанъ будеть", дзе творы айчынных геніяў самабытна і гарманічна паўстаюць на фоне класічных узораў еўрапейскага прыгожага пісьменства.

**Кот.** Ён апынуўся побач з Іванам Штэйнерам з уласцівай здольнасцю гэтай жывёлы з'яўляцца непрыкметна. Вобраз ката – у яго творах, выява ката – на афішах прэзентацый, цацачны кот – на кафедральным стале… У старажытныя часы кот лічыўся ахоўнікам сусветнага парадку на зямлі і гармоніі. Менавіта такую місію сёння выконвае і Іван Штэйнер. Плёну Прафесару!

**Ірына БАЖОК, Марына АММОН.**